1. У якіх раёнах Беларусі размешчаны пункты, найбольш аддаленыя ад мяжы? 2. Дзе знаходзяцца геаграфічны цэнтр Беларусі і геаграфічны цэнтр Еўропы? 3. З якімі краінамі мяжуе Беларусь (пералічыце іх па меры змяншэння даўжыні межаў)?

4. Вызначце асноўныя станоўчыя і адмоўныя асаблівасці фізіка-геаграфічнага і эканоміка-геаграфічнага становішча Беларусі. 5. Чаму Беларусь займае больш кампактную тэрыторыю, чым Партугалія, Чэхія, Аўстрыя? 6. Якая вобласць Беларусі мае найбольшую колькасць замежных суседзяў, якія вобласці Расіі і Украіны мяжуюць з Беларуссю?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Разлічыце, у колькі разоў большая або меншая тэрыторыя Беларусі ў параўнанні з краінамі-суседзямі.

## § 2. Фарміраванне тэрыторыі, адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел

***Узгадваем.*** *Якія адзінкі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу выкарыстоўваюцца ў краінах свету? Для чаго праводзіцца адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел?*

**Фарміраванне дзяржаўнай тэрыторыі.** Для Беларусі, размешчанай у цэнтры Еўропы, характэрная складаная гісторыя фарміравання тэрыторыі. Гэта абумоўлена пастаянным сутыкненнем палітычных інтарэсаў розных краін.

У X ст. на землях сучаснай Беларусі ўзніклі першыя дзяржавы — Полацкае і Тураўскае княствы, якія дасягнулі найбольшага росквіту ў XI ст. У XIII–XVI стст. тэрыторыя Беларусі ўваходзіла ў склад Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ). Тэрытарыяльную аснову ВКЛ складалі сучасныя беларускія землі. На працягу XVI–XVIII стст. Беларусь з'яўлялася часткай Рэчы Паспалітай, якая аб'яднала ВКЛ і Каралеўства Польскае. Напрыканцы XVIII ст., пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, беларускія землі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі і заставаліся ў ёй да 1917 г.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі і заканчэння Першай сусветнай вайны 1 студзеня 1919 г. была абвешчана Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусія (ССРБ). *Якія палітычныя падзеі адбываліся на пачатку 20-х гг. XX ст. у нашай краіне?* У 1920 г. яна была перайменавана ў Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку, а ў 1922 г. — увайшла ў склад СССР.

У 1920-х гг. адбылося змяненне межаў Беларусі. Спачатку (1919 г.) да Савецкай Расіі адышлі Магілёўская, Віцебская і Смаленская губерні. Затым па Рыжскім пагадненні (1921 г.) Заходняя Беларусь плошчай







Сучасныя межы Беларусі

Мал. 3. Тэрыторыя Беларусі ў 1920-х гг.

Мал. 4. Тэрыторыя Беларусі ў 1930–1940-х гг.

108 тыс. км$^2$ з насельніцтвам каля 4,6 млн чалавек увайшла ў склад Польшчы. У складзе БССР засталося толькі 6 паветаў Мінскай губерні. Плошча рэспублікі скарацілася да 52 тыс. км$^2$. Пасля вяртання 17 паветаў Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў у 1924–1926 гг. плошча БССР павялічылася да 125 тыс. км$^2$, а насельніцтва — да 5 млн чалавек (мал. 3). Наступнае ўдакладненне межаў Беларусі адбылося ў 1930–1940-х гг. У верасні 1939 г. у склад БССР увайшла Заходняя Беларусь, і плошча краіны склала 234 тыс. км$^2$. У 1940 г. частка зямель Віленскай вобласці была перададзена Літве, а ў 1946 г. за Польшчай замацаваны 20 раёнаў Беластоцкай і Брэсцкай абласцей (мал. 4). Апошняе ўдакладненне межаў паміж Смаленскай і Магілёўскай абласцямі адбылося ў 1964 г., пасля чаго дзяржаўныя межы Беларусі не змяняліся.

27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі, а ў верасні 1991 г. зацвердзіў новую назву — Рэспубліка Беларусь. 8 снежня 1991 г. былі падпісаны дакументы аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). У 1999 г. створана Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі. У 2010 г. пачаў дзейнічаць Мытны саюз Беларусі, Расіі і Казахстана. У 2012 г. ён быў пераўтвораны ў Адзіную эканамічную прастору, а ў 2015 г. — у Еўразійскі эканамічны саюз (ЕАЭС), да якога далучыліся Арменія і Кыргызстан.

**Гісторыя адміністрацыйнага падзелу Беларусі.** *Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел (АТП)* прадугледжвае падзел тэрыторыі дзяржавы на рэгіёны рознага рангу для ўдасканалення кіравання іх сацыяльна-эканамічным развіццём, а таксама краінай у цэлым. Кожная

адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка мае мясцовыя органы ўлады, якія падпарадкоўваюцца органам улады больш буйнога рангу.

Змены АТП Беларусі звязаны з этапамі фарміравання тэрыторыі. Першапачаткова існавалі *ўдзельныя княствы* і *землі*. У часы ВКЛ і Рэчы Паспалітай тэрыторыя падзялялася на *ваяводствы*, а тыя — на *паветы*. Пасля ўключэння Беларусі ў склад Расійскай імперыі асноўнымі адзінкамі АТП сталі *губерні* і *паветы*.

У 1924 г. у СССР быў уведзены новы адміністрацыйны падзел. Тэрыторыя была падзелена на *акругі* і *раёны*, а тыя — на *сельсаветы*. Пачынаючы з 1930-х гг. адміністрацыйны падзел Беларусі неаднаразова змяняўся. У 1938 г. уведзена новая адзінка — *вобласць*. Тэрыторыя краіны падзялялася на пяць абласцей і 90 раёнаў. Пасля аб'яднання з Заходняй Беларуссю колькасць адзінак АТП павялічылася да 10 абласцей і 195 раёнаў. Да сярэдзіны 1960-х гг. у Беларусі вылучаліся Баранавіцкая, Бабруйская, Вілейская (пазней — Маладзечанская), Пінская, Палеская і Полацкая вобласці, якія пасля былі скасаваныя. Пасля змен АТП у 1965–1966 гг. у рэспубліцы засталося шэсць абласцей і 117 адміністрацыйных раёнаў, якія захаваліся практычна нязменнымі да цяперашняга часу. Толькі ў 1989 г. быў створаны Дрыбінскі раён у Магілёўскай вобласці.

**Сучасны адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел.** Сучасны АТП Беларусі ўключае наступныя адзінкі: вобласць — раён — сельсавет або гарсавет. У Беларусі вылучаецца шэсць абласцей: Брэсцкая, Віцебская, Гомельская, Гродзенская, Магілёўская і Мінская. Плошча абласцей вагаецца ад 25,1 тыс. км$^2$ (Гродзенская) да 40,4 тыс. км$^2$ (Гомельская) (мал. 5). Яшчэ больш вобласці адрозніваюцца па колькасці жыхароў.




Мал. 5. Плошча (тыс. км$^2$) і насельніцтва (тыс. чал.) абласцей Беларусі на 01.01.2018

У Гродзенскай вобласці пражывае каля 1044 тыс. чалавек, а ў Мінскай (разам з г. Мінскам) — крыху больш за 3400 тыс. чалавек. У межах абласцей вылучаецца 118 раёнаў. Тэрыторыя адміністрацыйных раёнаў падзяляецца на сельсаветы (каля 1150). У якасці асобных адміністрацыйных адзінак выступаюць гарады і пасёлкі гарадскога тыпу, якія маюць абласное або раённае падпарадкаванне (мал. 6). Буйныя гарады падзяляюцца на гарадскія раёны. Асаблівы статус (горад рэспубліканскага падпарадкавання) мае сталіца Рэспублікі Беларусь — г. Мінск.

Такім чынам, на тэрыторыі Беларусі вылучаецца каля 1500 адміністрацыйных адзінак.

Сучасны адміністрацыйны падзел Беларусі склаўся ў часы СССР. Ён даволі груваcткі і прыводзіць да дубліравання асобных функцый адміністрацыйнымі адзінкамі. Пачынаючы з 1995 г. у краіне аб’ядноўваюцца адміністрацыйныя адзінкі з адным цэнтрам (кіраванне горадам і прылеглым раёнам). Распрацоўваюцца варыянты аптымізацыі АТП, якія прадугледжваюць скасаванне абласцей і ўзбуйненне раёнаў са скарачэннем іх ліку.

Чатыры абласныя цэнтры (Брэст, Віцебск, Гомель, Гродна) знаходзяцца на ўскраінах абласцей. Акрамя абласных цэнтраў, існуе больш за 10 буйных прамысловых цэнтраў, якія забяспечваюць занятасць насельніцтва. *Прапануйце варыянт змены АТП з вылучэннем 20–30 галоўных адміністрацыйных адзінак, якія замяняюць цэнтры абласцей і раёнаў.*




Мал. 6. Сучасны адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі на 01.01.2018

**Абагульнім і запомнім.** Рэспубліка Беларусь у 1991 г. стала суверэннай дзяржавай. У Беларусі вылучаецца каля 1500 адміністрацыйных адзінак, у т. л. 6 абласцей і 118 раёнаў.

1. Пералічыце асноўныя этапы фарміравання тэрыторыі Беларусі. 2. Якія адзінкі АТП існавалі ў Беларусі ў розныя часы? 3. Якія апошнія змены АТП Беларусі праводзіліся на ўзроўні абласцей і раёнаў?

4. Карыстаючыся картамі атласа, вызначце раённыя цэнтры, больш аддаленыя ад абласных цэнтраў, чым ад Мінска.

***Ад тэорыі да практыкі.*** Якія галоўныя адміністрацыйныя адзінкі, на ваш погляд, мэтазгодна пакінуць пры ўдакладненні адміністрацыйнага падзелу?

## § 3. Геаграфічныя даследаванні

***Узгадваем.*** *З якой мэтай праводзяцца геаграфічныя даследаванні? Які ўнёсак у развіццё геаграфічных даследаванняў свету зрабілі ўраджэнцы Беларусі? Якія сучасныя геаграфічныя навукі развіваюцца найбольш хуткімі тэмпамі?*

**Асноўныя этапы геаграфічных даследаванняў Беларусі.** Даследчыкі з Беларусі прымалі ўдзел у вывучэнні многіх куткоў свету. Апісанні іх падарожжаў утрымліваюць фактычны матэрыял пра прыроду і насельніцтва краін, у якіх яны пабывалі. Іх імёны можна знайсці на геаграфічных картах розных рэгіёнаў свету. *Прывядзіце прыклады і знайдзіце такія геаграфічныя аб'екты на картах.* Асаблівую цікавасць выклікаюць даследаванні Беларусі. У розныя часы яны мелі свае асаблівасці, адрозніваліся методыкай, абсталяваннем, арганізацыяй (мал. 7).




Мал. 7. Этапы геаграфічных даследаванняў Беларусі